**А. В. Духовіч**

# АДМЕТНАСЦІ ГІСТАРЫЗМУ Ў РАМАНЕ “КАЛАСЫ ПАД СЯРПОМ ТВАІМ” У. КАРАТКЕВІЧА І “ПАЧВАРНАЯ ГЕРЦАГІНЯ” Л. ФЕЙХТВАНГЕРА

Пытанне аб асаблівасцях развіцця гістарычнага рамана як жанру ў беларускай і нямецкай літаратурах знаходзіцца ў фокусе ўвагі даследчыкаў ужо працяглы час і застаецца актуальным у XXI ст. Параўнальнае вывучэнне раманаў У. Караткевіча „Каласы пад сярпом тваім“ (1965) іЛіёна Фейхтвангера „Пачварная герцагіня“ (1923) упершыню прадпрымаецца ў дадзеным даследаванні.

Як вядома, гістарычны раман уяўляе сабой сінтэз гістарычнай праўды з элементамі домыслу. Ён з'яўляецца адначасова гістарычным і культурным фактам эпохі, а таксама актам біяграфіі пісьменніка. Гістарычны падыход дазваляе інтэрпрэтаваць твор і пашырыць яго ўспрыняцце.

Параўнальны аналіз раманаў выявіў як падобныя, так і адметныя рысы ў мастацкім падыходзе да адлюстравання гістарызму. Агульнымі з'яўляюцца ўвага да гістарычнай дакладнасці, выкарыстанне рэальных падзей і асоб, імкненне паказаць гісторыю праз прызму асабістых перажыванняў герояў.

Сярод адметнасцей беларускага гістарызму выяўляецца глыбокая сувязь з нацыянальнай гісторыяй і культурай, што што выразна прасочваецца ў апісанні беларускіх традыцый, абрадаў і асаблівасцей жыцця. Гэта выклікана імкненнем захаваць і падкрэсліць нацыянальную ідэнтычнасць.

У рамане „Каласы пад сярпом тваім“ У. Караткевіч акцэнтуе ўвагу на гераічных аспектах беларускай гісторыі, адлюстроўваючы ўстойлівасць і мужнасць свайго народа. Л. Фейхтвангер у рамане “Пачварная герцагіня“ выкарыстоўвае гістарычны кантэкст для даследавання чалавечай псіхалогіі і сацыяльных механізмаў улады.

Творчая індывідуальнасць У. Караткевіча праяўляецца праз глыбокую любоў да радзімы, выказванне праз творы нацыянальных каштоўнасцей і ідэалаў. Асаблівасці стылю Л. Фейхтвангера – псіхалагічная глыбіня персанажаў, іранічны падыход да апісання гісторыі і крытычны погляд на грамадства.

Абодва раманы паказваюць, што літаратурны твор можа служыць не толькі эстэтычнай крыніцай, але і крыніцай ведаў пра мінулае і натхненнем для сучаснасці. Беларуская і еўрапейская гістарычная проза XX ст. з'яўляецца шырокім полем для далейшых даследаванняў, адлюстроўваючы нацыянальныя асаблівасці і агульначалавечыя каштоўнасці.